## ГЛАВА 14
## УВОЗ І (АБО) ВЫВАЗ, ВЯРТАННЕ КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

### Артыкул 76. Увоз і (або) вываз культурных каштоўнасцей

1. Увоз і (або) вываз культурных каштоўнасцей ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства аб культуры, заканадаўствам аб знешнеэканамічнай дзейнасці, заканадаўствам аб мытным рэгуляванні, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць нарматыўную прававую базу Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы і (або) права Еўразійскага эканамічнага саюза.

2. Вываз з мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза культурных каштоўнасцей, уключаных у адзіны пералік тавараў, да якіх прымяняюцца меры нетарыфнага рэгулявання ў гандлі з трэцімі краінамі, які вызначаецца актам, што складае права Еўразійскага эканамічнага саюза, ажыццяўляецца пры наяўнасці ліцэнзіі або заключэння (дазвольнага дакумента) у выпадках, прадугледжаных гэтым актам. У Рэспубліцы Беларусь выдача ліцэнзій ажыццяўляецца Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Міністэрствам культуры ў адпаведнасці з міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць нарматыўную прававую базу Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы і (або) права Еўразійскага эканамічнага саюза, выдача заключэнняў (дазвольных дакументаў) – Міністэрствам культуры ў адпаведнасці з гэтымі актамі, а таксама ў парадку і на ўмовах, устаноўленых Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

3. Вываз з Рэспублікі Беларусь на тэрыторыю дзяржавы – члена Еўразійскага эканамічнага саюза культурных каштоўнасцей, вызначаных Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляецца на падставе заключэння (дазвольнага дакумента), якое выдаецца Міністэрствам культуры ў адпаведнасці з міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць нарматыўную прававую базу Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы і (або) права Еўразійскага эканамічнага саюза, у выпадках, парадку і на ўмовах, устаноўленых Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

4. Увоз і (або) вываз культурных каштоўнасцей, прадугледжаных пунктамі 2 і 3 гэтага артыкула, якія знаходзяцца ў вышуку, забараняюцца.

### Артыкул 77. Вяртанне культурных каштоўнасцей

Культурныя каштоўнасці, вывезеныя з Рэспублікі Беларусь з парушэннем актаў заканадаўства, міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, якія дзейнічалі ў Рэспубліцы Беларусь на момант іх вывазу, і іншых норм міжнароднага права, а таксама часова вывезеныя з Рэспублікі Беларусь у эвакуацыю ў час узброеных канфліктаў або на іншай падставе і не

вернутыя ў Рэспубліку Беларусь без законных падстаў, падлягаюць абавязковаму вяртанню незалежна ад часу, абставін і месца вывазу.

**Артыкул 78. Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь**

1. У мэтах арганізацыі дзейнасці па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь ствараецца Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь.

2. Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, з’яўляецца пастаянна дзеючым дарадчым органам.

3. Асноўнымі задачамі Камісіі па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, з’яўляюцца:

3.1. вызначэнне прыярытэтных для Рэспублікі Беларусь напрамкаў дзейнасці па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь;

3.2. падрыхтоўка прапаноў па пытаннях выяўлення, вяртання, сумеснага выкарыстання і ўвядзення ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь.

4. Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь:

4.1. забяспечвае ўзаемадзеянне дзяржаўных органаў, грамадскіх аб’яднанняў, іншых юрыдычных асоб, грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, у мэтах зберажэння і памнажэння гісторыка-культурнай і археалагічнай спадчыны;

4.2. супрацоўнічае з нацыянальнымі і міжнароднымі органамі і арганізацыямі, дзейнасць якіх звязана з вяртаннем культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь;

4.3. спрыяе ажыццяўленню мерапрыемстваў па вяртанні культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь;

4.4. ажыццяўляе кантроль за працэсам вяртання культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь;

4.5. абмяркоўвае і ажыццяўляе падрыхтоўку прапаноў па праектах нарматыўных прававых актаў, іншых дакументаў па выяўленні, вяртанні,

сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь;

4.6. уносіць у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб фінансаванні дзейнасці па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь.

5. Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, мае правы:

5.1. уносіць у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы па асноўных напрамках і формах дзейнасці па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь;

5.2. звяртацца і атрымліваць ад дзяржаўных органаў і іншых юрыдычных асоб інфармацыю і матэрыялы па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Камісіі;

5.3. заслухоўваць на сваіх пасяджэннях паведамленні дзяржаўных органаў і іншых юрыдычных асоб па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Камісіі;

5.4. далучаць да сваёй дзейнасці работнікаў дзяржаўных органаў.